УДК 811.161.3’367’0

**Э. В. Ярмоленка** (Мінск)

# ТВОРНЫ ПРЫЙМЕННЫ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Дапаўненні шырока прадстаўлены ў разнажанравых тэкстах старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы. Яны выражаюцца рознымі часцінамі мовы, але часцей назоўнікамі ва ўскосных склонах без і з прыназоўнікамі. У дадзеным паведамленні разгледзім прыйменныя (пры назоўніках і прыметніках) дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону[1].

Вельмі частотнымі ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове былі канструкцыі з дапаўненнямі, выражанымі формамі творнага склону, пры назоўніках, якія па ўтварэнні і значэнні суадносяцца з дзеясловамі: <u>морду надъ девчинами</u>, тымъ млоденъцомъ допущовала (ИЮМ, IX, 293, 1637)[2]; бороды при самомъ тѣлѣ <u>саблею урзненье</u> (АВК, XII, 488, 1684). На думку А. А. Шахматава, “наўрад ці можна сумнявацца, што прыйменнае ўжыванне такіх склонаў [творнага і давальнага – *Э. Я.*] выклікана ўжываннем іх пры дзеясловах, часткова гэта сведчыцца тым, што такія склоны знаходзяць сабе месца пераважна пасля аддзеяслоўных назоўнікаў” [7, с. 314]. Іншыя даследчыкі таксама заўважаюць, што “значэнне творнага істотна не мяняецца, калі на месцы дзеяслова ставіцца адпаведны яму назоўнік, і характарызуем гэтыя значэнні таксама, як значэнні пры дзеяслоўным ужыванні” [6, с. 291].

У старабеларускіх тэкстах, як і ў сучаснай беларускай мове, такія канструкцыі перадавалі розныя значэнні. Найбольшая колькасць прыкладаў прыпадае на творны інструментальны, які ўказвае на прыладу, сродак, пры дапамозе якіх ажыццяўляецца дзеянне, выражанае назоўнікам: привелъ ихъ Гдь … мнѡгихъ

---

[1] Прыдзеяслоўныя дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону, разглядаліся намі ў паведамленні “Аб функцыянаванні канструкцый з творным склонам у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове” [8, с. 287–290].

[2] Прыклады падаюцца па: Гістарычны слоўнік беларускай мовы. – Мінск : Беларус. навука, 1982–2017. – Вып. 1–37.

рыбъ з$^{s}$ росказа*н*ѧ его закиненою сѣт$^{s}$ю оуловле*н*емъ до задивова*н*ѧсѧ привелъ (Каліст, II, 260б–261); ловене рыбъ норотами, вудами (ИЮМ, XXIV, 215, 1634); отца Гулинского у губу пястью ударенье (АВК, XV, 417, 1670).

Блізкія да разгледжаных вышэй канструкцый такія, якія называюць дзеянне і матэрыял, рэчыва і пад., што з'яўляліся сродкамі стварэння, узвядзення, вытворчасці і пад.: што сѧ пак$^{s}$ масло*м* помазываньѧ дотычеть (Будны, 225); несказите*л*ное тѣло те*р*пѣ*т* могло ѡбрѣза*н*е, млеко*м* ко*р*мле*н*е и гвоздьıа прибит*ı*а, и кр*с*тъ (Бельск., 328б); поливан$^{s}$е водою (Дзід., 8); бꙋде*т* покропленье тою водою третег дн*ѧ* (Хран., 140); За футроване у печы цеклою (ИЮМ, I, 191, 1681). Адзначаны выпадкі ўжывання ў такім значэнні і роднага прыйменнага: Крещеніе ѡ*т*правитисѧ может$^{s}$, по*л*ѣваніемъ воды на главꙋ (Зб. вып., 8б).

Творны са значэннем прылады, сродку ўжываецца і пры назоўніках, якія абазначаюць нематэрыяльнае дзеянне[1]: ѡ невызволенъе з воины листы нашыми (Ст. 1566, 20); ѡ*т* ѡбношеньѧ листо*м* ꙋпоминальнымъ … давность земъскую десе*т* леть промолъчалъ (Ст. 1588, 248); ѡ доходженью близъкостью або ıакимъ инымъ правомъ имене$^{s}$ (Ст. 1588, 231); то е*ст* детракциѧ ѡ*д*нымъ сло*в*ко*м* ıако мовıа*т* або те*ж* рꙋшенемъ головы ки*в*не*н*емъ (Зб. 261, 156); покаранье четвертованьемъ мужобойцы (АСД, I, 346, 1643); на контемтъ стану копланского ... словами непристойными диффамованье (АВК, XI, 280, 1697).

Творны склон зафіксаваны пры назоўніку *оженение*: взложили на мене … поневолное оженене з дочкою неякого попа Чыжа (АВК, XXXIV, 301, 1663). Выкарыстанне творнага склону ў гэтай пазіцыі звязваюць з тым, што яшчэ ў агульнаўсходнеславянскі перыяд пры шэрагу дзеясловаў, якія абазначалі нематэрыяльнае пераходнае дзеянне суб'екта, ужываўся творны інструментальны, праз які названае дзеянне пераўтварае суб'екта [5, с. 281].

Творны прыйменны можа выяўляць прэдыкатыўную прымету: Приспособе*н*е до с҃новства, оучинен$^{s}$е сыном$^{s}$ (Бяр., 168); што было причиною до ганеньѧ и до называн$^{s}$ѧ костантѣ антихрісто*м* (Апакр., 57).

Канструкцыі з творным прыйменным могуць перадаваць суб'ектныя адносіны – называць дзеянне і выканаўцу дзеяння (жывую істоту або прадмет, паняцце): почто не зжалилсѧ еси ѡ приıатьи тре*х* ıаецъ даміано*м* (Чэцця, 67б–68); арендовал ему десіатую часть перевозу на реце … от розыстіа леду аж до станіа реки ледомъ (ИЮМ, XXXII, 142, 1578); отъ … щаванья псами (АВК, II, 314, 1642); по зепсованю натꙋры наше$^{s}$ грѣхо*м* великаıа е*ст* в на*с* склонность до ѕлого (Выкл., 9); чаровъ, гꙋсловъ … запѣсованѧ сѧ діаволомъ ... выстерегалисѧ (Зб. вып., 105).

Прыйменныя канструкцыі з творным склонам у старабеларускай мове функцыянавалі паралельна з падобнымі прыдзеяслоўнымі канструкцыямі, параўн.: *битье розгами – бити дупцы, воротами приваленье – привалити каменьми, маетностями шафованье – ласкою шафовати, ширмованье шаблею – ширмовати языком*: маеть росказати катꙋ вести до пре*н*кгира и тамъ его дꙋпцы бити (Ст. 1588, 87) – Римошевского ... у пренгера розгами битьемъ всказуемъ (АВК, X, 82, 1695); справа о ширмованье черезъ его около головъ ихъ шаблею добытою (АВК, XV, 68, 1662) – ıазыкомъ ıако мечемъ з ѡбоихъ сторо*н* ѡстрымъ не ши*р*мовали (Зб. 259, 516).

[1] На думку даследчыкаў, у такіх канструкцыях значэнне прылады крыху аслабляецца і замяняецца больш шырокім значэннем ускоснага аб'екта [2, с. 134].

У старабеларускіх тэкстах атрымаў пашырэнне і творны адносін, які стаіць пры слове, што абазначае якасць [3, с. 418; 4, с. 261]: Мы князь Семенъ, инымъ именемъ Лыгвеній, чинимъ знаменито (АЗР, I, 26, 1389); бѣѧше прорчица ѕвѣздарька имене*м* сивилла (Сівіла, 2); был государъ тому ѡстрову именемъ Давлитесъ (Трыст., 71). Адзначана ўжыванне ў гэтай пазіцыі і формы вінавальнага склону *на имя*: жаловалъ намъ мещанинъ плебанеи витебъское ко*р*микъ на ˢмѧ костькодѹло*в* (КВЗС, 51, 1533).

Спалучэнні з назоўнікам у творным склоне з прыназоўнікам *съ* (*со*, *зъ*) часта перадаюць адносіны сумеснасці (сацыятыўныя адносіны): алеѯа*н*дръ гѡ*д* мешкалъ во индии со всимъ воиско*м* свои*м* (Алекс. XV, 2); десеть грошей с платкомъ изъ запазушья выпало (АВК, XXI, 41, 1555); укралъ былъ еси пчолы съ кореникомъ у Процька (АВК, XVIII, 43, 1582); зняли ... игольникъ с поесомъ (АВК, XXXVI, 44, 1582); Ключата с тыми вахтовниками кватерниками своими шляхтичовъ учстивыхъ побилъ (АВК, XX, 175, 1601). У такіх канструкцыях звычайна аб’яднаны назоўнікі аднаго семантычнага разраду (*Ключата – вахтовникъ, маетность – млынъ – фолюшъ – одрына, явья – клоймъ* і г.д.): в гумъне явья с клоймомъ (АВК, XXXII, 186, 1596); маетность продала ... зъ млыномъ паперным зъ млыномъ мучнымъ зъ фолюшомъ зъ галтаромъ (АВК, X, 260, 1631). Творны сацыятыўны абазначае прадмет самастойны па адносінах да галоўнага слова, які суіснуе з ім [3, с. 416].

Канструкцыі з прыназоўнікам *съ* могуць таксама паказваць адносіны аб’екта, якія нешта змяшчае, і змесціва: въ максима пѧть кореневъ со пчоломи снѧли (КВЗС, 134б, 1540); ровоа*с* теды алеѯа*н*дрови золотыˢ кубокъ зъ ѧдо*м* подалъ (Алекс., 44б); ѹказовалъ мѣшокъ з пѣнѧзми (Пралог, 576б); записал замок ... з людми (СДГВ, 62, 1679).

Канструкцыі з творным склонам з прыназоўнікам *съ*, у якіх галоўнае слова суадносіцца з дзеясловам, выражаюць аб’ектныя адносіны: на скуточъную розъправу з пенами ... до насъ враду ремисса станула (АВК, XX, 464, 1676). Такія адносіны могуць набываць таксама адценне сумеснасці: тотъ возный ... в Городку, пры бытности моей и пры розмавлѧнью моемъ с княземъ Богданом не был (АВК, XXXVI, 41, 1582); Листъ мой тотъ сховай … до узрѣнья зо мною (АВК, VI, 84, 1584); сполечность зˢ римскимъ костело*м* жадной бы в той мѣре акцесии не оучинила (Апакр., 203б); игриска, и заводы ко*н*скіе, и полева*н*е со псами, и вшелѧкіе порожніе молодого вѣкѹ забавы ... за ништо собѣ важи*л* (Варл., 260).

Аб’ектныя адносіны могуць выражаць спалучэнні з назоўнікам, суадносным з дзеясловам, з прыназоўнікам *надъ*: вгроженьѧсѧ в насъ самы*х* и пышного панованьѧ на*д* сѹмненьемъ нашимъ не шукали (Апакр., 203).

Адносіны сумеснасці або ўзаемнасці выяўляюць таксама і канструкцыі з прыназоўнікамі *межи, между*, *промежи*, *промежку* і пад.: ка*к* бы ни ѡдна была розность межи тою звездою а с҃лнце*м* (Валх., 45б); постанове*н*ье промежи замко*м* и место*м* Поло*ц*ки*м* з стороны люде*и* пу*т*ны*х* сельски*х* и и*н*ши*х* речеи (ПГ, II, 174, 1500); былъ ѡ томъ делъ межи насъ (КСД, 20, 1510).

Пры прыметніках дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону, абазначаюць асобу або прадмет, па адносінах да якіх праяўляецца пэўная прымета. Дапаўненні, якія адносяцца да прыметнікаў, могуць суадносіцца з дапаўненнямі пры дзеясловах (выражаюцца пераважна назоўнікамі ў творным склоне без прыназоўнікаў): ч҃лкъ зародокъ женˢскіи … сы*т* гнѣво*м* (Зб. 262, 17б), а могуць

не суадносіцца з дапаўненнямі пры дзеясловах (выражаюцца назоўнікамі ў творным склоне без прыназоўнікаў і з прыназоўнікам *съ*): вделали суть вси мудріи серцемъ ко поставленію храма (Скар. КВ, 68); нога гржбаѧ мѧсо*м* оуказоуеть глоуповъство и кривдолюбіе (Арыст., 179); нашо*л* мѣстце на*д* ѡзеро*м* пѹщами реками и розлогами вдѧ*ч*ное и красное (Стрыйк., 514б); мы … надали есьмо … и половину луга Древоскипища, сумежную зъ его милостью паномъ Ходкевичомъ (АВК, XI, 11, 1521).

Выяўлены канструкцыі, дзе ўжываецца творны склон для абазначэння аб'екта, рамкамі якога абмяжоўваецца прымета, што перадаецца прыметнікам (творны абмежавальны): чл҃къ зародокъ женѕскіи коротокъ дн҃ьми (Зб. 262, 17б); молодица красна позоро*м* (Зб. 262, 128); ѡ носѣ ... а боудет ли конець его дологъ и тонокъ. се е*ст* доуренъ и легокъ дѣлы своими и ходо*м* (Арыст., 198); кон находникъ шерстью белы (АВК, XXXIX, 61, 1578); украли ... возничъка шерстью карого (АВК, XXXVI, 233, 1582); дей той сверепы шерстью ворононькое (АВК, XVIII, 224, 1610); птахи нб҃сные живитъ и лилеи полные такою сличностю приоздобляетъ (Варл., 92б).

Некаторыя канструкцыі выяўляюць аб'ектныя адносіны з сэнсавым адценнем унутранага зместу прыметы, выражанай прыметнікам [1, с. 193]: довольни будете оброки вашими (Скар., ДЗ, 3б); Вы мѹжеве доволны бѹдте своихъ жѡнъ чистою любовію (Каліст, I, 47б).

У дзелавых тэкстах прадстаўлена значная колькасць канструкцый з аб'ектнымі адносінамі, утвораных аддзеяслоўнымі прыметнікамі [1, с. 190]: до дня и року своего певного … ничим не отменного (ИЮМ, XXXII, 62, 1578); пустилъ домъ свой властный, никому ничымъ не вступъный ани заведеный (ИЮМ, XXX, 24–25, 1577); кордъ серебром оправный (АВК, XXXVI, 42, канец XVI ст.); речъ слушную и зъ правомъ посполитымъ згодъливую (АВК, XXIV, 4, 1684).

Праведзенае даследаванне паказала, што ў старабеларускай літаратурнапісьмовай мове шырока ўжываўся творны прыйменны склон. Дапаўненні, выражаныя формамі творнага склону, выкарыстоўваліся для перадачы аб'ектных, суб'ектных адносін, а таксама адносін замяшчэння і сумеснасці. Паралельна з канструкцыямі з творным прыйменным у старабеларускай мове ўжываліся канструкцыі з родным склонам (*полеванье водою – полеванье воды*), а таксама з вінавальным (*именемъ – на имя*). Побач з прыйменнымі канструкцыямі з творным склонам шырока функцыянавалі падобныя прыдзеяслоўныя канструкцыі (*битье розгами – бити дупцы, воротами приваленье – привалити каменьми*).

ЛІТАРАТУРА

1. *Булахаў, М. Г.* Гісторыя прыметнікаў беларускай мовы. Сінтаксічны нарыс / М. Г. Булахаў. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. – Ч. 2. – 296 с.

2. Грамматика русского языка. Синтаксис. Ч. 1. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1954. – Т. 2. – 703 с.

3. *Карский, Е. Ф.* Белорусы / Е. Ф. Карский. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1956. – Т. 2 : Язык белорусского народа. Вып. 2 : Исторический очерк словообразования и словоизменения в белорусском языке; Вып. 3 : Очерки синтаксиса белорусского языка. – 518 с.

4. Сравнительно-исторический синтаксис восточнославянских языков. Члены предложения. – М. : Наука, 1968. – 298 с.

5. *Ломтев, Т. П.* Очерки по историческому синтаксису русского языка / Т. П. Ломтев. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1956. – 596 с.

6. Творительный падеж в славянских языках / под. ред. С. Б. Бернштейна. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1958. – 379 с.

7. *Шахматов, А. А.* Синтаксис русского языка / А. А. Шахматов. – М. : Эдиториал УРСС, 2001. – 624 с.

8. *Ярмоленка, Э. В.* Аб функцыянаванні канструкцый з творным склонам у старабеларускай літаратурнапісьмовай мове / Э. В. Ярмоленка // Адзінаццатыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. арт. ; Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак [і інш.]; адк. рэд. В. Д. Старычонак. – Мінск, 2018. – С. 287–290.